# Педагогіка

УДК 371.4

**У.В. Пашкевіч**

# Педагагічныя аспекты праблемы маральнага самавызначэння школьнікаў

У айчыннай, а таксама зарубежнай філасофіі, псіхалогіі, сацыялогіі, педагогіцы не так шмат спецыяльных работ, прысвечаных вывучэнню праблемы маральнага самавызначэння. Нягледзячы на частае выкарыстанне гэтага тэрміна, паняцце «маральнае самавызначэнне» яшчэ недастаткова вызначана, не ў поўнай меры інтэрпрэтаваны з'явы, якія ўплываюць на станаўленне і фарміраванне маральнага самавызначэння асобы.

У філасофіі самавызначэнне разглядаецца як «імкненне ўстанавіць свой кантынуум самарэалізацыі і яго сэнс» [1], пры гэтым пад «імкненнем» разумеецца і патрэбнасць у самарэалізацыі, і воля да яе, і сам працэс устанаўлення кантыніума самарэалізацыі і яго сэнсу.

Найбольш дасканала распрацавана праблема, што нас цікавіць, у псіхалагічным аспекце, дзе самавызначэнне разглядаецца ў якасці інтэгральнага матыву жыццёвай актыўнасці і важнейшага мабілізацыйнага рэсурсу чалавечай псіхікі (З. Фрэйд, Э. Фром, К. Юнг, В. Франкл, С.Л. Рубінштэйн, І.С. Кон, В.Ф. Сафін, К.А. Абульханава-Слаўская і інш.).

У псіхалагічным слоўніку пад рэд. А.У. Пятроўскага і М.Г. Ярашэўскага канстатуецца, што «самавызначэнне асобы – свядомы акт выяўлення і сцвярджэння ўласнай пазіцыі ў праблемных сітуацыях» [2].

Праблема самавызначэння асобы ў агульнапаводзінскім разуменні разглядаецца ў работах псіхолага В.Ф. Сафіна. Асоба, якая самавызначаецца, на яго думку, – гэта сацыяльна сталы чалавек, што валодае высокім узроўнем развіцця інтэлекту, фізічных сіл, практычных уменняў і навыкаў, неабходных для сацыяльна накіраванай жыццядзейнасці. У псіхалагічным аспекце такая асоба ўсведамляе свае мэты, жыццёвыя планы, асобасныя і фізічныя ўласцівасці, тое, што ад яе чакае калектыў (грамадства) [3].

Уяўляюць цікавасць даследаванні замежных псіхолагаў па гэтай праблеме. Так, у працах амерыканскага псіхолага А. Маслоу вялікая ўвага надаецца пытанням самаактуалізацыі. А. Маслоу лічыць, што адной з важнейшых патрэбнасцей асобы з'яўляецца патрэбнасць у самаактуалізацыі – рэалізацыі здольнасцей, талентаў чалавека. Самаактуалізацыю псіхолаг лічыў бесперапынным працэсам. На яго думку, яна азначае шматлікія асобныя выбары: ілгаць або заставацца чэсным, красці або не красці. Самаактуалізацыя азначае выбар з гэтых магчымасцей магчымасці росту. Чалавек самаактуалізуецца, калі бярэ на сябе адказнасць [4]. Гэты вывад абсалютна супадае з думкамі айчынных філосафаў, псіхолагаў, педагогаў, якія лічаць, што адказнасць з'яўляецца вядучай маральнай уласцівасцю асобы, якая самавызначаецца.

А. Маслоу разумее самаактуалізацыю не толькі як канчатковы стан, але таксама як і працэс актуалізацыі сваіх магчымасцей.

У сваю чаргу В.Франкл лічыць, што «самаактуалізацыя не можа быць дасягнута, калі яна замыкаецца на саму сябе. Яна дасягальна толькі тады, калі з'яўляецца пабочным эфектам саматрансцэндэнцыі» [5].

На патрэбнасць чалавека у самаактуалізацыі звяртае ўвагу і Роджэрс. На яго думку, у кожным з нас ёсць імкненне станавіцца кампетэнтным і здольным настолькі, наколькі толькі гэта магчыма для нас біялагічна. Як расліна імкнецца быць здаровай раслінай, як зерне ўтрымлівае ў сабе імкненне стаць дрэвам, так чалавек імкнецца стаць цэласным, поўным, самактуалізуючымся чалавекам [6].

Можна сказаць, што ў заходніх тэорыях асобы рост асобы разумеецца ў сэнсе ўмацавання яе самасці: узрастанне аўтаномнасці, самавызначэння, самаактуалізацыі. Чалавек, згодна заходніх тэорый, імкнецца да самасцвярджэння, ён аўтаномна існуе, расце і актыўна сябе сцвярджае.

З этычнага пункту гледжання самавызначэнне разглядаецца як адна з важнейшых маральных каштоўнасцей, каштоўнасцей чалавечага жыцця (Аўгусцін, М. Бубер, У. Джэймс, Н. Лоскі, Дж. Мур, С. Франк і інш.).

Цікавасць уяўляюць таксама працы, вучэнні прыкладнога і рэлігійна-філасофскага характару, дзе практычныя пытанні самавызначэння індывіда звычайна звязваюць з рознымі сістэмамі фізічнага і духоўнага самаўдасканалення. Так, напрыклад, у дзэн-будызме сцвярджаецца, што кожны чалавек валодае злольнасцю развіцця ў дасканалую чалавечую істоту; што «правільна» – павінен вырашыць сам чалавек, прымаючы на сябе адказнасць за свае ўчынкі. Для нас цікавым з'яўляецца, што ў вучэнні надаецца вялікая ўвага маральнаму самавызначэнню і самаўдасканаленню чалавека: праца над сабой дае магчымасць нянавісць ператварыць у любоў, ілюзорнасць – у мудрасць. Адзін з галоўных прынцыпаў будызму – прывядзенне паўсядзённага жыцця ў гармонію з ідэаламі і каштоўнасцямі.

Мэта йогічнай практыкі – адзінства індывідуальнай самасці з касмічным духам або самарэалізацыя, самапазнанне.

У філасофскай і псіхолага-педагагічнай літаратуры разглядаюцца розныя віды самавызначэння: маральнае (А.А. Гусейнаў, М.Д. Зотаў, А.Д. Драбніцкі, В.С. Соіна, А.М. Архангельскі, В.Н. Шэрда, Д.Ж. Валееў і інш.), прафесійнае (Т.С. Георгіева, А.М. Кухарчук, А.Б. Цанцыпер, П.А. Шавір, Ф.І. Івашчанка і інш.), жыццёвае (В.І. Жураўлёў, В.Л. Лебедзева і інш.), у працах М.А. Дабрыніна сустракаецца такое спалучэнне, як працоўнае самавызначэнне [7].

У нашым даследаванні асаблівая ўвага ўдзяляецца маральнаму самавызначэнню. У працах Н.Д. Зотава [8] маральнае самавызначэнне разглядаецца як спецыфічны від паводзінскага самавызначэння. Аўтар указвае на той факт, што ў маралі кожны раз індывід самавызначаецца ў тым, што ён як маральная істота (г.зн. як істота, якая арыентуецца на маральныя патрабаванні, звярае з імі ўсе свае дзеянні) можа (павінна) сабе ў дадзеным канкрэтным (прававым, палітычным, бытавым і г.д.) дзеянні дазволіць, прадпісаць, а што забараніць. «Працэс маральнага самавызначэння здзяйсняецца бесперапынна, але ў кожны момант гэтага працэсу ён здзяйсняецца як асобага роду духоўна-практычнае дзеянне, як вызначэнне сябе ў тым, якім я магу або якім мне належыць быць у маральных адносінах. У гэтым сэнсе ў сітуацыях, якія маюць маральнае значэнне, індывід увесь час, кожнае імгненне «выбірае» сябе ў якасці суб'екта маральнасці такімсьці і такімсьці, выбірае самавызначаючыся» [8, с. 30]. Нельга не пагадзіцца з думкай даследчыка, што вядучую ролю ў маральным самавызначэнні адыгрывае ўсведамленне асобай абавязуючай сілы маральных патрабаванняў, унутранае прыняцце іх і ўсвядомлена-актыўнае, вольнае прытрымліванне патрабаванняў маральна належнага. Сутнасць маральнага самавызначэння Н.Д.Зотаў разглядае ў рэчышчы катэгорыі маральнасці

най адказнасці. Увогуле пра маральнае самавызначэнне, на думку аўтара, можна гаварыць толькі тады, калі маральнае «я» аб'ектывізуецца ў рэальных паводзінах суб'екта, іншымі словамі пры «адзінстве маральнай свядомасці і паводзін» [8, с. 45]. Пры гэтым зазначаецца, што перад выхаваўчымі інстанцыямі стаіць задача – «узняць маральную свядомасць суб'екта да такой ступені дасканаласці, якая забяспечвае ўстойлівую паводзінскую рэалізацыю норм індывідам» [8, с. 45].

В.Н. Шардакоў [9] сутнасць маральнага самавызначэння бачыць ва ўсведамленні асобаю мэтаў і выбару ўчынкаў у рамках дабра і зла. Маральнае самавызначэнне даследчык разглядае як функцыю свядомасці і самасвядомасці.

А.Г. Драбніцкі зазначае, што маральнае самавызначэнне – гэта не проста прытрымліванне прынятых ў грамадстве нормаў, а замацаванне таго, што павінна быць. Як і іншыя даследчыкі А.Г. Драбніцкі сцвярджае думку, што маральная адказнасць з'яўляецца сістэмаўтвараючай уласцівасцю маральнага самавызначэння. «У маральнай адказнасці, – зазначае А.Г. Драбніцкі, – канцэнтрыруецца ўвесь комплекс маральных патрабаванняў, якія арыентуюць асобу ў выбары неабходных для карысці грамадства ўчынкаў» [10].

Д.Ж. Валееў разглядае маральнае самавызначэнне як адну з важнейшых характарыстак сацыялізацыі. Ен бачыць фарміраванне маральнай асобы як канечную мэту этычнай асветы, а маральнае самавызначэнне – як паказчык гэтага працэсу, а таксама тое, у якой ступені асоба здольна самастойна здзяйсняць маральны выбар [11]. У сваю чаргу мы згодны з думкай К.А. Абульханавай-Слаўскай, якая лічыць, што «маральнае самавызначэнне не складаецца з асобных маральных рашэнняў, выбараў, учынкаў, як гэта часцей за ўсё ўяўляюць, а менавіта ў выпрацоўцы патрэбнасці ва ўзвышана-духоўным жыцці».

Дэтэрмінантамі паводзін асобы з'яўляюцца маральныя каштоўнасці, яе маральныя каштоўнасныя арыентацыі, яны непасрэдным чынам уплываюць на маральны выбар. Агульначалавечыя маральныя нормы, што пануюць у грамадстве, могуць быць аб'ектам выбару асобы толькі таму, што яны падмацоўваюцца сістэмай грамадскіх, сацыяльных санкцый. У гэтым выпадку цяжка гаварыць пра асобу, як пра асобу, што самавызначаецца. Іншая справа, калі маральныя нормы грамадства становяцца для асобы каштоўнымі, гэта значыць, задавальняючымі патрэбнасці. Тады яны выступаюць як эталон не проста неабходнага, але і пажаданага. Гэтыя развагі прыводзяць нас да высновы, што праблему самавызначэння школьнікаў лепш разглядаць у ракурсе аксіялагічнага падыходу.

Гэты шлях апраўданы яшчэ і тым, што ў псіхалагічных даследаваннях маральнага самавызначэння вялікае значэнне надаецца маральнаму ідэалу як інтэгрыруючаму пачатку. А як вядома, маральны ідэал з'яўляецца адной з форм маральных каштоўнасцей. Даследаванні, праведзеныя пад кіраўніцтвам Л.І. Бажовіч паказалі, што ў маральным самавызначэнні ідэал, з аднаго боку, стварае больш або меньш пастаянную і інтэнсіўную сістэму маральных памкненняў, а з другога – з'яўляецца маральным крытэрыем учынкаў чалавека ў розных жыццёвых сітуацыях. Менавіта сфарміраваны ідэал выступае рэгулятарам паводзін.

Таму невыпадкова сёння педагагічная думка актыўна шукае новыя шляхі маральнага ўдасканалення вучняў на аснове аксіялагічнага падыходу. Асноўныя педагагічныя падставы фарміравання асобы школьніка – уключэнне яе ў сітуацыю выбару каштоўнасцей, іх асэнсаванне, маральна-матываваныя адносіны, дапамога ў ацэнцы і самаацэнцы сваіх дзеянняў, учынкаў.

Сучасная парадыгма выхавання прадугледжвае не навязванне тых ці іншых каштоўнасцей, а стварэнне неабходных умоў для іх пазнання, разумення і выбару, стымуляцыю гэтага выбару і далейшую ўнутраную працу школьніка над сваімі ўчынкамі і дзеяннямі.

Кожны чалавек мае сваю індывідуальную іерархію маральных каштоўнасцей. Яна, гэта іерархія, аб'ядноўвае асобу з духоўнай культурай грамадства. У маральных каштоўнасцях адлюстроўваюцца ўяўленні аб добрым і дрэнным, шчасці і бядзе, любові і нянавісці, сумленнасці і несумленнасці і г.д. З іх дапамогай чалавек можа ацэньваць канкрэтныя жыццёвыя сітуацыі, учынкі людзей і свае паводзіны. Маральныя каштоўнасці ахопліваюць увесь прадметны свет з'яў, разглядаюць іх з пункту погляду таго, прыносяць яны карысць ці шкоду. Асабістыя маральныя каштоўнасці школьніка характарызуюць яго маральны свет. Стрыжань гэтай сістэмы – маральны ідэал, які адлюстроўвае ўяўленні аб вышэйшым сэнсе быцця чалавека, яго развітых маральных якасцях, узоры высокамаральных паводзін. Каб дасягнуць ідэалу, вучню прыходзіцца кіравацца ў сваім жыцці маральнымі прынцыпамі і нормамі, якія, па сутнасці, з'яўляюцца для яго арыенцірамі ў выбары тых або іншых учынкаў. Маральныя прынцыпы адлюстроўваюць найбольш агульныя патрабаванні да паводзін людзей. Канкрэтызуюцца прынцыпы ў дачыненні да рэальных сітуацый жыццядзейнасці людзей у маральных нормах. Сацыяльна важкія ідэалы, прынцыпы, нормы складаюць змест маралі. Таму правамерна меркаванне, што мараль – гэта сукупнасць каштоўнасцей, якія арыентуюць людзей у практычных адносінах; гэта ідэалы, прынцыпы, нормы, погляды на дабро і зло, на належнае, на сэнс жыцця, на годнасць і гонар, на ўсю сістэму адносін асобаснага і грамадскага.

Трэба адзначыць, што самі паводзіны мараллю не з'яўляюцца. Нараджаючыся, жывучы ў пэўным грамадстве з пэўнай канкрэтна-гістарычнай сістэмай маральных каштоўнасцей, вучань успрыме іх як нешта устойлівае, раз і назаўсёды дадзенае. Школьнік выбірае, засвойвае маральныя каштоўнасці або не прымае іх, займаючыся рознымі відамі дзейнасці, вызначаючы свае адносіны да працэсу дзейнасці, яе сродкаў і вынікаў, да іншых людзей, усяго грамадства, прыроды, сябе самога. Саму маральную інфармацыю вучань атрымоўвае пры моўных зносінах, праз творы літаратуры, мастацтва. Важную ролю адыгрывае вусная народная творчасць, традыцыі, звычаі, абрады народа.

Зразумела, што першапачаткова дзіця ўспрымае сістэму маральных каштоўнасцей грамадства ў выглядзе канкрэтных форм паводзін, якія ён назірае ў сям'і, садку, школе, пазашкольных установах. Дзіця дзейнічае (пры гэтым адчувае такую неабходнасць) так, як робяць іншыя людзі, пераносіць і ўзнаўляе свае дзеянні ў адпаведных сітуацыях. Таму мы можам гаварыць аб тым, што на першапачатковым этапе засваення маралі адбываецца знешняе рэгуляванне паводзін дзіцяці з боку асоб, якія аказваюць на яго пэўнае ўздзеянне.

Само ж дзіця яшчэ не ў стане зразумець і ацаніць сапраўдны сэнс маральных патрабаванняў, супаставіць учынкі з учынкамі іншых людзей. На наступным этапе фарміруюцца ўжо свядомыя адносіны школьніка да засваення маральных патрабаванняў. Вучань спазнае грамадскае значэнне сутнасці маральных каштоўнасцей, ацэньвае іх, зыходзячы са сваіх патрэбнасцей, інтарэсаў, пачуццяў, што садзейнічае станаўленню індывідуальных адносін да гэтых каштоўнасцей.

Нельга назваць той канкрэтны час, калі пачынаецца фарміраванне асэнсаваных адносін да нормаў і прынцыпаў маралі, таму што ў кожнага чалавека, ў залежнасці ад умоў яго жыцця, асаблівасцей развіцця і выхавання, ён праходзіць больш хуткімі або павольнымі тэмпамі. Не з'яўляюцца выключэннем выпадкі, калі ў адной асобе сумяшчаюцца свядомыя адносіны да адных ма-

ральных нормаў і неўсвядомленыя – да другіх.

Працэс засваення грамадскай маралі залежыць ад некаторых акалічнасцей. Як зазначаюць даследчыкі, у працэсе засваення грамадскай маралі школьнік выбірае з маральных каштоўнасцей тыя, якія прапаноўваюцца грамадствам, узгадняе іх:

– з аб'ектыўнымі ўмовамі сваёй жыццядзейнасці, з інтарэсамі, поглядамі непасрэднага асяроддзя;

– з якасным зместам сваіх палітычных, рэлігійных і іншых поглядаў і перакананняў;

– з набытым раней індывідуальным маральным досведам.

Свядома ці неўсвядомлена, засвойваючы або не прымаючы пэўныя маральныя каштоўнасці грамадства, вучань набывае пэўныя маральныя якасці, якія ў многім вызначаюць яго як асобу.

Маральныя каштоўнасныя арыентацыі фарміруюцца ў свядомасці асобы ў выніку ўплыву маральных каштоўнасцей, якія пануюць у грамадстве ў дадзены момант, або тых, якія з даўніх часоў прызнаваліся грамадствам, прапагандаваліся, але, у сілу пэўных прычын, не займаюць сваё адпаведнае месца сёння. Ступень сфарміраванасці маральных каштоўнасных арыентацый асобы школьніка ў ходзе маральнага самавызначэння дазваляе яму ўсвядоміць сябе не толькі аб'ектам выхаваўчых уздзеянняў, але і суб'ектам дзеяння, які мае пэўны маральны вопыт.

Патрэбнасць і здольнасць асобы да маральнага самавызначэння ў многім абумоўлена ўзроўнем развіцця грамадства. Сёння на змену традыцыйнай школе, для якой характэрна жорсткая ўстаноўка на прытрымліванне норм, прадпісанняў, інструкцый, прыходзіць школа развіваючая. У гэтых умовах набывае надзвычайную актуальнасць прынцып самавызначэння асобы, які павінен прыйсці на змену прынцыпу яе жорсткага рэгламентавання. Нормай для новай школы становіцца магчымасць выбару новых варыятыўных праграм, падручнікаў, тэхналогій навучання і выхавання. Разам з тым, усё гэта стварае толькі стартавыя магчымасці для працэсу самавызначэння школьнікаў. Нават у спрыяльных для маральнага самавызначэння ўмовах асоба можа рэалізаваць свае здольнасці самавызначыцца, а можа не рэалізаваць і існаваць, кіруючыся інстынктамі і набытымі ва ўласным вопыце ўменнямі і навыкамі.

Таму задачай школы становіцца стварэнне спрыяльных умоў для маральнага сталення і самавызначэння вучняў, што, у сваю чаргу, абумоўлівае пазнанне педагагічнай сутнасці і механізму працэсу маральнага самавызначэння.

Нягледзячы на вялікую колькасць літаратуры па пытаннях маральнага выхавання школьнікаў, пакуль што не існуе спецыяльных прац і педагагічных даследаванняў, прысвечаных непасрэдна праблеме маральнага самавызначэння асобы вучня. Мы разглядаем маральнае самавызначэнне школьнікаў як фенамен, які мае каштоўнасна-сэнсавую аснову і грунтуецца на свядомым вызначэнні сваёй маральнай жыццёвай пазіцыі, маральных адносін да каштоўнасцей грамадства так і ўласных.

Як адбываецца працэс маральнага самавызначэння? У сваіх меркаваннях мы зыходзім з таго, што працэс маральнага самавызначэння, па-першае, самастойны, як аб'ект даследавання, від самавызначэння, па-другое, ён з'яўляецца неад'емнай часткай і асновай, на якой грунтуюцца іншыя віды самавызначэння, у першую чаргу жыццёвае, прафесійнае, сацыяльнае і іншыя, па-трэцяе, працэс маральнага самавызначэння працякае на працягу ўсяго жыцця, ён можа актывізавацца, пераходзіць на больш высокі ўзровень на пэўных этапах развіцця асобы школьніка.

А.Я. Галубчыкаў [12] правамерна зазначае, што «асноўныя цяжкасці пра-

цэсу самапазнання звязаны з яго пачаткам і складанасцю падзелу сябе на суб'ект і аб'ект пазнання». Вырашэнне гэтай задачы можа адбыцца адносна позна, у сталым узросце ў выніку і пад уздзеяннем пэўных сацыяльных умоў, а можа – значна раней пад уздзеяннем выхавання і навучання. Нам падаецца надзвычай важным і адказным у гэтых адносінах падлеткавы перыяд, калі вельмі актыўна развіваецца працэс самаўсведамлення. Менавіта ў гэты перыяд, на думку Л.І. Бажовіч завяршаецца ўзнікненнем асобаснага новаўтварэння, якое можна назваць тэрмінам «самавызначэнне». З пункту гледжання самасвядомасці суб'екта яно характарызуецца ўсведамленнем сябе ў якасці члена грамадства і канкрэтызуецца ў новай, грамадска значнай пазіцыі.

У сваю чаргу, працэс маральнага самавызначэння мае свае ўнутраныя этапы фарміравання і развіцця. Нам уяўляецца магчымай наступная схема рэалізацыі дадзенага працэсу:

**I этап** – этап так званага неактыўнага пазнання. У гэты час адбываецца засваенне маральных норм, неўсвядомленае успрыняцце іх як жыццёва неабходных («так трэба», «глядзі і рабі, як раблю я»...). У дзіцяці не ўзнікае думкі: чаму так трэба рабіць, а не іначай; маральны аўтарытэт бацькоў, выхавацеляў надзвычай высокі.

**II этап** – этап выбару на аснове цікавасці, інтарэсу. Аб'ектам выбару на гэтым этапе могуць быць вобразы, учынкі, дзеянні герояў кніг, кінафільмаў, сяброў. З гэтага этапу, на нашу думку, пачынаецца ўстойлівае імкненне школьніка да самарэалізацыі.

**III этап** – этап маральнага самадосведу. На гэтым этапе дзіця ставіць мэту маральнага самапазнання і самаўдасканалення. Перад школьнікам паўстаюць пытанні: хто я такі, чым я адрозніваюся ад іншых, што для мяне характэрна, якія мае магчымасці, якое маё прадназначэнне, сэнс майго існавання? Зразумела, што і да гэтага этапу дзіця мае пэўныя ўяўленні аб сабе існым і павінным. Тым не меньш менавіта на гэтым этапе адкрываюцца магчымасці маральнага самаўдасканалення.

**IV этап** – этап актыўнага фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый, ацэнкі, самаацэнкі, свядомага маральнага выбару. Гэты этап надзвычай блізкі да папярэдняга.

На гэтым этапе свядомасць школьніка набывае здольнасць адасабляць мэту ад прадмета, вылучаць эталон ацэнкі, з якім супастаўляюцца прадметы і г.д. Ацэнка на гэтым перыядзе захоўвае эмацыянальна-каштоўнасную афарбаванасць, выступае апасрэдаваным звяном паміж пазнаннем і практыкай дзіцяці. У гэты час ацэнка суб'екта паступова становіцца адным з рэгулятараў яго паводзін, а таксама паводзін акаляючых, што, у выніку, з'яўляецца зыходным момантам узнікнення маральнага самавызначэння. Адэкватная і правільная самаацэнка садзейнічае маральнай актыўнасці школьніка, накіраванай на фарміраванне маральных каштоўнасных арыентацый. Дэтэрмінантамі маральнага выбару выступаюць маральныя каштоўнасці.

Устойлівае праяўленне актыўнасці суб'ектам, на нашу думку, ёсць пераход на наступны 4 этап – этап вызначэння шляхоў маральнага ўдасканалення, свядомага рэгулявання сваіх учынкаў і дзеянняў.

Важнай у плане маральнага самавызначэння формай актыўнасці – жыццёвай пазіцыі чалавека, якая выражаецца ў яго прынцыповасці, паслядоўнасці, адстойванні сваіх поглядаў, адзінства слова і справы, з'яўляецца маральная адказнасць – рэгуляцыя суб'ектам сваіх паводзін на аснове ўласнага маральнага выбару (Піажэ, Кольберг, Хайдэр і інш.). Маральная адказнасць ператва-

рае знешне абавязковае ва ўнутрана патрэбнае, што суправаджаецца пераходам да маральнага самакантролю.

Стаўшы рысай свядомасці і паводзін, маральная адказнасць дапамагае школьніку лёгка арыентавацца і спраўляцца з маральнымі патрабаваннямі, узгадняць гэтыя патрабаванні з уласнымі жаданнямі. Пры дапамозе сфарміраваных маральных каштоўнасных арыентацый на гэтым этапе дасягаецца аўтаматызм у маральным самакіраванні.

Апошні, 5 этап – этап самарэалізацыі. Самарэалізацыя сама па сабе ўяўляе самастойную каштоўнасць. Гэта вынік усіх прыватных формаў самавызначэння, у тым ліку і маральнага. Працэс самарэалізацыі – безупынны працэс. Не будзе перабольшаннем, калі зазначым, што імкненне да самарэалізацыі з'яўляецца адной з важнейшых састаўляючых увогуле працэсу жыцця.

У заключэнне зазначым, што працэсу маральнага самавызначэння школьнікаў садзейнічае мэтанакіраваная работа па фарміраванні адэкватнай самаацэнкі вучняў, фарміраванні і выпрацоўцы такіх якасцей як адказнасць і ініцыятыўнасць.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Красиков В.И.*** Метафизика самоопределения. Кемерово: Кузбассвузиздат, 1995. С. 33.
2. ***Психология***. Словарь / Под общ. ред. ***А.В. Петровского, М.Г. Ярошевского***. 2-е изд., испр. и доп. М.: Политиздат, 1990. С. 351.
3. ***Ников Г.П., Сафин В.Ф.*** Педагогические проблемы сапоопределения личности // Советская педагогика, № 4, 1983. С.78-81.
4. ***Психология личности.*** Тексты / Под ред. ***Ю.Б. Гиппенрейтер, А.А. Пузырея***. М.: Изд-во МГУ, 1982. – 288 с.
5. ***Франкл В.*** Поиск смысла жизни и логотерапия. В кн.: Психология личности. Тексты / Под ред. ***Ю.Б. Гиппентейтер, А.А.Пузырея***. М.: Изд-во МГУ, 1982. С. 124.
6. ***Теории личности в западно-европейской и американской психологии***. Хрестоматия по психологии личности. Самара: Издательский Дом «Бахрах», 1996. С. 391.
7. ***Добрынин М.А.*** Влияние семьи на выбор профессии старшим школьником. В сб.: «Проблемы профессии и профконсультации в школе». М.,1969. С. 177.
8. ***Зотов Н.Д.*** Нравственное самоопределение личности. М.: Знание, 1983. – 640 с.
9. ***Шердаков В.Н.*** Добро-истина-красота. М., 1983. – 97 с.
10. ***Дробницкий О.Г.*** Понятие морали. М.: Наука, 1974. С. 24.
11. ***Валеев Д.Ж.*** Моральное самоопределение личности как показатель эффективности нравственного воспитания. В кн.: Проблемы коммунистического воспитания студентов. Уфа, 1982. С. 129-133.
12. ***Голубчиков А.Я.*** Самоопределение индивида (социально-философский анализ). Автореф.дис. ... д-ра. филос. наук.: 09.00.11 – социальная философия. Екатеринбург, 1993. – 38 с.



*S U M M A R Y*

*The article deals with pedagogical aspects of the problem of pupils' moral self-determination, stages formation.*



*Поступила в редакцию 10.09.2000*